Минск, 17–18 ноября 2011 г. / Ин-т социологии НАН Беларуси. – Минск, 2011. – С. 94–97.

2. *Кравченко, А. И.* Культурология: словарь / А. И. Кравченко. – М. : Акад. проект, 2000. – 671 с.

3. Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.pravo.by. – Дата доступа : 05.09.2017.

4. *Перцева, Ю. И.* Культурная политика: к определению понятия / Ю. И. Перцева // Изв. ВолгГТУ. – 2010. – № 8. – С. 92–93.

5. Право Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.lawbelarus.com/002008. – Дата доступа : 05.09.2017.

6. Родная Ніва [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.rodniva.by/2016/02/2016-god-v-belarusi-god-kultury. – Дата доступу : 07.09.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ФАРМІРАВАННЕ СЯМЕЙНАЙ КУЛЬТУРЫ НА АСНОВЕ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

***К. М. Барташ,***

*студэнт кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

У сувязі з працэсамі глабалізацыі існуе праблема захоўвання ўнікальнасці святочна-абрадавых традыцый Беларусі. Ва ўмовах тэхналагічнага прагрэсу нагледжваецца частковае змешванне традыцый розных народаў, а таксама развіццё сучаснага грамадства па заходнім стандартам, пераймаюцца формы вольнага часу еўрапейскай культуры. Усё гэта ўплывае на стан сучаснай культуры Беларусі, а таксама культурны ўзровень яго грамадзян.

Усведамляючы народную культуру як высокую духоўную каштоўнасць, важна адчуваць адказнасць за сваю творчую інтэрпрэтацыю фальклорных традыцый, якія выносяцца на суд гледачоў. Пры гэтым варта быць зразумелым сучаснаму чалавеку, данесці да яго духоўныя ідэі народнай культуры, умацаваць каштоўнаснае стаўленне да нацыянальных культурных традыцый і абудзіць цікавасць да іх спазнання і захавання.

На парозе XXI ст. распрацоўваецца ўзаемадзеянне святочных традыцый з сучаснымі формамі вольнага часу. Існуе пагроза сур’ёзных дэфармацый у сістэме святочна-абрадавай

дзейнасці, ідзе працэс размывання межаў у іерархіі субкультур і свята з цягам часу пазбаўляецца свайго сакральнага ядра – абраду, ператвараючыся ў сферу забаў.

Ва ўмовах сучаснага грамадства, дзе на першы план выходзяць праблемы сямейнага інстытута (разводы, маці-адзіночкі, незарэгістраваныя шлюбы і г. д), большую ўвагу трэба засяродзіць на культуры сям'і. Сямейная культура праз традыцыі, абрады, рытуалы адлюстроўвае дасягненні чалавекам пэўных мэтаў, зыходзячы з каштоўнасных арыентацый.

У кантэксце тэмы намі было разгледжана паняцце «традыцыя» (ад лац. traditionem – перадача, паданне). Гэта – норма, правіла маральных паводзін людзей, пэўныя дзеянні ў жыцці і ў побыце, якія склаліся, замацаваліся ўсвядомасці і паўсядзённай практыцы народа і перадаюцца з пакалення ў пакаленне [1, с. 8–10]. Сувязь паміж словамі «абрад» і «традыцыя» самая арганічная. Звычаі самі па сваёй прыродзе традыцыйны, яны і служаць сродкамперадачы традыцыі. Абрады і традыцыі маюць у жыцці чалавека ролю своеасаблівага акумулятара і перадатчыка сацыяльнага вопыту [2, с. 103–110]. Такім чынам, вывучэнне сямейных традыцый, культуры сямейных зносін, культуры сямейнага вольнага часу, сямейнага асяроддзя адпавядаюць задачам захавання ўзаемаадносін і ўстойлівасці самога інстытута сям'і.

На сучасным этапе ў шлюбна-сямейным інстытуце існуе крызіс. Крызіс сям'і праяўляе вялікія збоі ў духоўным і маральным свеце чалавека. Бягучы стан сведчыць аб тым, што ў цяперашні час у шлюбна-сямейным інстытуце існуе шэраг праблем, адной з якіх з'яўляецца трансфармацыя святочна-абрадавай культуры, у прыватнасці сямейнай абраднасці. Усе гэтыя праблемы патрабуюць навуковага падыходу ў іх вырашэнні. Сямейныя абрады з'яўляюцца часткай духоўнай культуры беларускага народа, іх значэнне і ролю ў пераемнасці каштоўнасцяў сям'і, роду цяжка пераацаніць.

Лічым неабходным разгледзець структуру сямейнай абраднасці. Структура сямейнай абраднасці складалася на працягу доўгага адрэзку часу, што дазволіла зрабіць адбор лепшых узораў і замацаваць у калектыўнай памяці тыя кампаненты, якія запатрабаваны і сучасным пакаленнем. Сямейныя абрады выконвалі, па сутнасці, функцыі абрадаў пераходу чалавека ад

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

аднаго статусу да іншага. Тэрмін «абрады пераходу» разумеецца як сімвалічныя дзеянні, накіраваныя на забеспячэнне пераходу чалавека з адной свецкай або магічна-рэлігійнай супольнасці ў іншую. Жыццё канкрэтнага чалавека абумоўлена паслядоўнымі пераходамі ад аднаго ўзросту да другога і ад аднаго роду дзейнасці да іншага. Там, дзе пераход ад адной дзейнасці да іншай з'яўляецца жыццёвай вяхой, ён суправаджаецца адмысловымі дзеяннямі [4, с. 189].

Да традыцыйных сямейных абрадаў беларускага народа адносяцца: вяселле, нараджэнне дзяцей, абрады шанавання продкаў. Гэтыя абрады існавалі ў савецкі перыяд у беларускіх сем'ях. Да новых абрадаў, якія былі сфарміраваны савецкім ладам жыцця, варта аднесці абрады атрымання пашпарта (дзень паўналецця), заканчэння навучальнай установы («Апошні званок»), провадаў на службу ў Савецкую Армію, атрымання першай зарплаты, провадаў на пенсію і інш.

Намі была разгледжана структура вясельнага абраду паводле кнігі «Беларуская народная творчасць», дзе апісаны складаныя часткі абраду «Вяселле» [5, с. 5–37], пасля чаго было праведзена назіранне за дзейнасцю ўстаноў культуры Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці з мэтай выяўлення наяўнасці сямейных традыцый, якія культывуюцца ў дадзеным рэгіёне. Па выніках назірання намі былі вылучаны наступныя ўстановы, якія прымяняюць у сваёй працы сямейныя традыцыі.

Як сведчыць артыкул Беларускага тэлеграфнага агенцтва, сёння майстэрствам вырабу «чырвоных горак», «пляцёнак», «Бабкіных пірагоў» і іншых караваяў валодаюць удзельніцы народнага аматарскага аб'яднання «Чараўніцы-каравайніцы» Навасёлкаўскага цэнтра культуры. Яны з'яўляюцца носьбітамі і транслятарамі традыцыі выпечкі слонімскіх караваяў. Стварэнне ў 1983 г. гэтага аматарскага аб'яднання вельмі дапамагло падтрымцы і захаванню элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны [3; 6].

У калектыў уваходзяць мясцовыя жанчыны, адна з якіх з'яўляецца старэйшай каравайніцай. Яна першая пачынае кожны этап у выпечцы каравая: сыпле муку, расчыняе і месіць цеста, кіруе ўсім працэсам прыгатавання каравая. Увесь працэс выпечкі суправаджаецца народнымі песнямі і заклічкамі. Саб-

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

раны матэрыял па абраду «Выпечка каравая» захоўваецца ў школьным музеі.

Філіял «Кастравіцкі цэнтр вольнага часу» прапануе правядзенне вясельнага рытуалу на ўрачыстай рэгістрацыі шлюбу. Абрад праводзіць народны вакальны ансамбль «Славяначка». Маладых сустракаюць з хлебам і соллю, абсыпаюць зернем, бо ёсць прыкмета: «Колькі зярнят трапіць ў кішэнь маладога, столькі дзетак у яго будзе» і інш.

Філіял «Сялявіцкі цэнтр культуры» таксама прапануе рытуал збору маладой да ўрачыстай рэгістрацыі шлюбу. У склад абраду ўваходзяць заплятане касы, сустрэча маладога, провады маладых, абрад рушніка, асыпанне зернем маладых і шмат іншых абрадаў, якія суправаджаюцца песнямі і рэтуальнымі дзеяннямі.

У канчатковым выніку можна гаварыць аб тым, што ў грамадстве павялічваецца інтарэс да традыцыйнай сямейнай абраднасці, сямейныя святы (у прыватнасці вясельны абрад) з цягам часу з'яўляюцца больш запатрабаванымі сярод моладзі. Сямейныя традыцыі ўсё часцей сталі прымяняцца ў дзейнасці ўстаноў культуры. Але трэба надаваць больш увагі інтэрпрэтацыі сямейных традыцый і ведаць, якія святы мы святкуем і з якой мэтай. Вывучаючы святочную культуру, можна зразумець, што ў дадзены момант пераважае ў культуры і як грамадства ставіцца да сваіх духоўных каштоўнасцей.


1. *Бойцова О.* Фотография в обрядах перехода / О. Бойцова // Визуальная антропология: настройка оптики / под ред. Е. Ярской-Смирновой, П. Романова. – М., 2009. – С. 189–191.

2. Вяселле : абрад / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; уклад., уступ. арт. і камент. К. А. Цвіркі ; муз. дадат. З. Я. Мажэйка ; рэд. тома : В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – 2-е выд. – Мінск, 2004. – С. 5–37.

3. *Іванова, Ж.* Слонімскія караваі割 стануць гісторыка-культурнай каштоўнасцю [Электронны рэсурс] / Ж. Іванова // Газета Слонімская. – 20 дек. 2016 г. – Рэжым доступу : http://www.gs.by/ru/1019/news/ 33401/ Слонімскія-караваі-стануць-гісторыка-культурнай-каштоўнасцю.htm.

4. *Кухаронак, Т. І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 238 с.

5. Технология социально-культурной деятельности : учеб.-метод. пособие / Л. И. Козловская [и др.] ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2014. – С. 103–110.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*6.* Традиция выпечки караваев на Слонимщине обретет статус историко-культурной ценности [Электронный ресурс] // БелТА. Культура. – 19 дек. 2016 г. – Режим доступа : http://www.belta.by/culture/view/traditsija-vypechki-karavaev-na-slonimschine-obretet-status-istoriko-kultur-noj-tsennosti-224409-2016/.

# ПРОЦЕСС ФОРМИРОВАНИЯ ЦЕННОСТНОГО ОТНОШЕНИЯ МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ К НАРОДНОЙ КУЛЬТУРЕ БЕЛАРУСИ СРЕДСТВАМИ ДЕКОРАТИВНО-ПРИКЛАДНОГО ИСКУССТВА

***К. А. Бекиш,***
*магистрант кафедры педагогики социально-культурной деятельности Белорусского государственного университета культуры и искусств*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ценностное отношение – это отношение человека к миру, сторонами которого являются предметные и субъектные ценности. Предметные ценности – все объекты мира, оцениваемые человеком с точки зрения добра и зла, истины и лжи, прекрасного и безобразного, справедливого и несправедливого. К таким ценностям относятся предметы материальной и духовной деятельности людей, общественные отношения и включенные в их круг природные явления, имеющие для человека положительное значение и способные удовлетворять его разнообразные потребности. Субъектные ценности – это установки, оценки, требования, запреты и т. д., выступающие ориентирами и критериями деятельности людей [1, с. 52].

Формирование ценностного отношения младших школьников к народной культуре Беларуси должно подкрепляться углубленным изучением декоративно-прикладного творчества: искусства традиционной росписи, вытинанки, вышивки, ткачества, соломоплетения, гончарства, аппликации и др., воплощающих коллективный творческий потенциал народа.

Актуальность проблемы обусловлена социальным заказом общества на приобщение подрастающего поколения к ценностям национальной художественной культуры, выработанным веками, – эстетическим идеалам белорусского народа.

В государственных документах Республики Беларусь, таких как Концепция воспитания детей и учащейся молодежи в Рес-